# Першыя драмы Рыа

**Усе ўрачыстыя мерапрыемствы з нагоды адкрыцця ХХХІ Алімпійскіх гульняў у Бразіліі ўжо ў мінулым. Пасля цырымоніі, якая доўжылася амаль чатыры гадзіны, алімпійскі агонь над стадыёнам «Маракана» запаліў бразільскі марафонец Вандэрлей Кардэйру ды Ліма, а цяпер на спартыўных арэнах з раніцы да позняга вечара ідзе жорсткая барацьба за алімпійскія медалі.**

За гэтыя некалькі дзён Гульняў нашы спартсмены ўжо дазволілі перажыць беларускім заўзятарам цэлы спектр эмоцый. Як пазітыўных — выхад Андрэя Ліхавіцкага ў фінал гімнастычнага мнагабор'я, выхад у паўфінал Кацярыны Карстэн і калег па камандзе ў акадэмічным веславанні, так і негатыўных, якія звязаны з тым, што шэраг беларускіх спартсменаў ужо завяршылі свае выступленні ў Рыа. Адной з падстаў для суму стала і стартавае выступленне жаночай баскетбольнай зборнай. Свой першы матч дзяўчаты саступілі японкам, хоць мелі перавагу ў ліку па ходзе сустрэчы, а другі на апошніх секундах прайгралі французжанкам. Але не варта адчайвацца, шанцы на поспех нашы дзяўчаты яшчэ маюць!



## Модная перамога

Пакуль у нашай каманды няма медалёў, але грамадскасць ужо звярнула ўвагу на беларускую дэлегацыю. Нацыянальныя матывы ў форме беларускіх алімпійцаў ацанілі буйныя амерыканскія выданні, назваўшы форму нашых спартсменаў адной з самых стыльных на гэтых Гульнях.

## Легенда ў вадзе

Плывец Майкл Фэлпс упершыню ў гісторыі спорту стаў алімпійскім чэмпіёнам у 19-ы раз. Напярэдадні ў складзе зборнай ЗША ён выйграў фінал эстафеты 4х100 метраў вольным стылем. Усяго на рахунку Фэлпса 23 медалі Алімпійскіх гульняў.

## Квіткі дадому

Некаторыя атлеты, ледзь пачаўшы сваё выступленне на Гульнях, ужо могуць пакаваць чамаданы. Першымі з беларусаў з Алімпіядай-2016 развітваюцца тэнісісты. У парным разрадзе Максім Мірны і Аляксандр Буры саступілі ў сваім стартавым матчы.

Могуць адпраўляцца дадому і нашы прадстаўнікі дзюдо. Дар'я Скрыпнік і Дзмітрый Шэршань прайгралі паядынкі папярэдняга раўнда. Вікторыя Чайка ў алімпійскім турніры па кулявой стральбе заняла толькі 16-е месца, а Аляксандра Прывалава (настольны тэніс) завяршыла выступленне ў трэцім раўндзе спаборніцтваў.

Надоўга ў Рыа не затрымалася і беларуская прадстаўніца ў спартыўнай гімнастыцы. Натуралізаваная Кайлі Дыксан у спаборніцтвах па праграме мнагабор'я заняла перадапошняе, 58-е, месца, апярэдзіўшы толькі прадстаўніцу Алжыра.

## Алімпійскія слёзы

Спорт высокіх дасягненняў не магчымы без траўмаў — гэта ісціна зразумелая як самім спартсменам, так і ўсім аматарам атлетычнага свету. Асаблівы крыўдна, калі пашкоджанні здараюцца падчас самага адказнага старту чатырохгоддзя, тут эмоцыі стрымаць проста немагчыма. Гэта пацвердзяць тыя, хто бачыў падзенне французскага гімнаста Саміра Айт Саіда пасля апорнага скачка. Нага спартсмена склалася практычна напалову: лекары дыягнаставалі пералом вялікай і малой галёначных костак. Хаця спартсмен паказаў добры вынік на кольцах, які дазваляў яму ўдзельнічаць у фінале на гэтым снарадзе. Акрамя таго, зборная Францыі мела добрыя шанцы прабіцца ў васьмёрку наймацнейшых у камандных спаборніцтвах.

Першыя слёзы праліліся і на алімпійскія тэнісныя корты. Там у стартавым матчы завяршыў сваё выступленне Новак Джокавіч — першая ракетка свету. Серб прайграў аргенцінцу Хуану Марціну Дэль Потра — 6:7, 6:7.



Такім жа кароткім было выступленне яшчэ адных тэнісных «зорак». Амерыканкі Серэна і Вінус Уільямс, якія тройчы станавіліся алімпійскімі чэмпіёнкамі ў парным разрадзе, выбылі ўжо пасля стартавага паядынку. Сёстры пацярпелі паражэнне ад саперніц з Чэхіі Люцыі Шафаржавай і Барбары Стрыцавай — 3:6, 4:6.

Гэта першае паражэнне трохразовых (2000, 2008, 2012) алімпійскіх чэмпіёнак у парным разрадзе алімпіяд.

## Суровая Бразілія

Арганізатары яшчэ да пачатку Гульняў папярэджвалі, каб прыезджыя спартсмены і заўзятары былі вельмі асцярожныя на вуліцах Рыа-дэ-Жанэйра, бо Бразілія досыць крымінагенная краіна, па статыстыцы кожныя 10 хвілін там адбываецца адно забойства. Не абышлося без здарэнняў і на старце Алімпійскіх гульняў. Двое падлеткаў, узброеныя нажамі, абрабавалі трэнера нацыянальнай зборнай Аўстраліі па веславанні недалёка ад алімпійскай вёскі.

Адная настаўніка злачынцы прымусілі легчы на зямлю, а да горла другога прыставілі халодную зброю з лязом даўжынёй 20 см, паведамляе ў сваім блогу ў сетцы «Твітар» аўстралійскі журналіст Дэніэл Сатан.

У выніку трэнеры пазбавіліся тэлефонаў, кашалька, а таксама аднаго пінжака, у якім удзельнік дэлегацыі быў на цырымоніі адкрыцця.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.38 | 20.51 | 15.13 |
| Віцебск — | 5.23 | 20.45 | 15.22 |
| Магілёў — | 5.28 | 20.41 | 15.13 |
| Гомель — | 5.30 | 20.32 | 15.02 |
| Гродна — | 5.54 | 21.06 | 15.12 |
| Брэст — | 6.00 | 21.02 | 15.02 |

## Месяц

***Маладзік 02.08—09.08. Месяц у сузор'і Скарпіёна.***

## Імяніны

***Пр.*** *Анфісы, Мікалая, Навума.*
***К.*** *Ірыны, Клары, Тэрэзы, Рамана.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

### 9 ЖНІЎНЯ

*Дзень Нагасакі. У 1945 годзе амерыканская авіяцыя падвергла атамнай бамбардзіроўцы японскі горад Нагасакі. Загінула 74 тысячы чалавек.*

**1705** год — пад уплывам чуткі, што цар Пётр І збіраецца падпісаць указ аб забароне на 7 гадоў выдаваць астраханскіх дзяўчат за мясцовых хлопцаў і загадзе заключаць шлюбы толькі з немцамі, якіх для гэтага быццам бы прышлюць з Казані, у Астрахані адначасова згулялі сотню вяселляў. Пасля чаго разагрэтая выпіўкай моладзь учыніла ночну разню іншаземцаў, якая перарасла ва ўсенароднае выступленне, вядомае ў гісторыі як Астраханскае паўстанне 1705-1706 гадоў. Другой яго нагодай стаў ужо рэальны ўказ Пятра І аб забароне насіць традыцыйнае для таго часу рускае адзенне і бараду, які мясцовы ваявода Цімафей Ржэўскі выконваў з незвычайнай стараннасцю і жорсткасцю. Толькі вясной 1706 года войску фельдмаршала Б.П. Шарамецева ўдалося задушыць смуту.

**1893** год — нарадзілася Вера Васільеўна Халодная, руская актрыса перыяду нямога кіно, зорка рускага дарэвалюцыйнага экрана. З 1914 года здымалася ў кіно. Іграла галоўным чынам у салонных драмах і меладрамах, ствараючы абаяльныя лірычныя вобразы прыгожай, адзінокай жанчыны, якую ашукалі вераломныя палюбоўнікі, або нікім не зразумелай асобы. Здымалася ў фільмах: «Міражы», «Маўчы, сум, маўчы», «Жывы труп», «Апошняе танга» і інш.

**1936** год — на Алімпійскіх гульнях у Берліне славутыя амерыканскі чарнаскуры спартсмен Джэсі Оўэнс выйграў чацвёртыя залатыя медаль — гэтым разам у эстафеце 4х100 м. Першыя перамогі ён атрымаў у бегу на 100 і 200 м і скачках у даўжыню. Стаўшы галоўным героем Алімпіяды, Оўэнс фактычна нанёс аплявуху Адольфу Гітлеру і нацысцкай прапагандзе, якія выкарыстоўвалі гульні для дэманстрацыі переваг і «сапраўдных арыйцаў».



**1941** год — савецкая авіяцыя Чырванасцяжнага Балтыйскага флоту нанесла першы бомбавы ўдар па ваенных аб'ектах Берліна (камандзіры авіяцыйных груп палкоўнік Я.М. Праабражэнскі, капітаны В.А. Грачышнікаў і А.Я. Яфрэмаў). Усе самалёты паспяхова вярнуліся на аэрадром, размешчаны на адным з эстонскіх астравоў.

**1946** год — нарадзілася Алена Вадзімаўна Каралёва, беларускі хімік, доктар хімічных навук. Аўтар навуковых прац па арганічнай і біяарганічнай хіміі, хіміі прыродных і гетэрацыклічных злучэнняў. Распрацавала і ажыццявіла арыгінальныя схемы поўнага сінтэзу мадыфікаваных простагландынаў, сярод якіх выяўлены біялагічна актыўныя злучэнні для стварэння лекавых сродкаў.

### Было сказана

**Янка ЛУЧЫНА, паэт:**

*«Не я пяю — народ божы*
*Даў мне ў песні лад прыгожы».*

## УСМІХНЕМСЯ

Вучуся ў медыцынскім, з нагоды заканчэння сесіі вырашылі замовіць ежу з рэстарана. Патэлефанаваў кур'еру, распавядаю дзе інтэрнат, а ён кажа: «А, я ведаю дзе гэта, я сам медыцынскі скончыў». Абнадзеіў.

**Часам Вова прачынаецца шчаслівы і вясёлы. Потым успамінае, што жанаты.**




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.



Шаноўную спадарыню **Аляксандру ДАНЧАНКА** — адданую падпісчыцу «Звязды», прыгожую і разумную жанчыну, мудрую настаўніцу, руплівую гаспадыню, нястомную дабрачынніцу ў адносінах да блізкіх і чужых — шчыра віншуем з прыгожай датай! Зычым моцнага здароўя, поспехаў, дабра і дабрабыту — яшчэ на многія, многія гады!

**Лучынскія сябры і сваякі.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3211.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 8 жніўня 2016 года.